**Шапавалава, А.** «Страшней было не ў паветры, а на зямлі» / А. Шапавалава // Пастаўскі край. — 2010. — 13 лют. — С. 4.

## «СТРАШНЕЙ БЫЛО НЕ Ў ПАВЕТРЫ, А НА ЗЯМЛІ»

Кожны раз, сустракаючыся напярэдадні 15 лютага з воінамі-інтэрнацыяналістамі, пераконваюся, колькі б дзесяцігоддзяў ні аддзяляла іх ад тых падзей, памяць пра афганскую вайну застанецца ў сэрцах назаўсёды. А разам з ёй – боль, які да канца могуць зразумець толькі тыя, хто таксама прайшоў вогненнымі дарогамі Афганістана...

У гэту, як мы кажам зараз, «гарачую кропку», Станіслаў Ігнацьевіч Раманчук трапіў у канцы жніўня 1982 года маладым лейтэнантам, неўзабаве пасля заканчэння Сызранскага вышэйшага ваеннага вучылішча лётчыкаў.

– Нас усім складам палка – а службу я тады праходзіў у Беларусі, на аэрадроме ў Пружанах – нечакана адправілі ў водпуск, – успамінае ветэран. – Безумоўна, мы западозрылі нешта нядобрае, але пра тое, што паедзем у Афганістан, не думалі: уся звязаная з ім інфармацыя была засакрэчаная. Не здагадваліся, і што там адбываецца на самай справе. Ведалі толькі, што ёсць нашы войскі, што яны аказваюць нейкую дапамогу. У большасці сваёй ехалі з інтарэсам: як там, у іншай краіне? Вядома ж, маладыя, нідзе, акрамя Расіі і Беларусі, яшчэ не былі.

Спачатку ўвесь полк, у якім служыў С. І. Раманчук, на самалётах перабазіравалі ў Сярэднюю Азію, у раён Бухары, для праходжання горнай падрыхтоўкі, бо палёты ў гарах адрозніваюцца ад звычайных: у іх ёсць пэўныя асаблівасці і складанасці. Заадно на працягу гэтага месяца прайшлі і акліматызацыю. А затым зноў жа самалётамі полк перакінулі ў Кандагар.

– Першае, што ўразіла, калі ступілі на афганскую зямлю, – яе звычайная спёка. А быў ужо вечар, на вуліцы амаль сцямнела, – працягваў расказваць Станіслаў Ігнацьевіч. – Неўзабаве адносную цішыню прарэзаў пранізлівы голас мулы, які недзе на мінарэце чытаў малітву. Ад яго аж мароз па скуры прайшоў. У гэты ж вечар атрымалі і першае баявое хрышчэнне: пакуль ехалі на аэрадром, дзе павінны былі пераначаваць, нас абстралялі са стралковай зброі. Нашы вадзіцелі былі ўжо прывычныя да гэтага, а мы літаральна размазаліся па падлозе машыны, калі ў брызенце сталі з'яўляцца дзіркі ад куль. Ноччу таксама быў абстрэл.

Пераначаваўшы, раніцай наступнага дня полк пераляцеў у Джалалабад, на сваё пастаяннае месца дыслакацыі. Каб было зразумела, што гэта за месца, заўважым: горад знаходзіцца на ўсходзе Афганістана, непадалёк ад граніцы з Пакістанам, адкуль у краіну паступала асноўная частка зброі і пранікалі душманы. Раён з субтрапічным кліматам: практычна круглы год спёка, нават у дзень тэмпература рэдка апускаецца ніжэй за 47 градусаў.

У дзень прылёту туды (а полк С. І. Раманчука змяняў іншы полк, які адпраўлялі дамоў) аднакашнік Станіслава Ігнацьевіча па ваенным вучылішчы, які трапіў у Афганістан годам раней, якраз паехаў хаваць свайго барттэхніка, які загінуў літаральна за 6 дзён да замены: іх верталёт збілі душманы. З расказаў таварышаў даведаліся, што аэрадром абстрэльваюць практычна пастаянна. Таму кожную ноч некалькі нашых верталетаў «завісалі над ім, ахоўваючы сябе, а раніцай з 4 да 6 гадзін трэба было ляцець на заданне. Спаць амаль не даводзілася. Часам ноччу адбівалі атакі, калі некалькі банд баевікоў, аб'яднаўшыся, спрабавалі захапіць аэрадром.

– Калі бываю ў школах, вучні часта задаюць пытанне, ці страшна было ў Афганістане, – адступае ад асноўнай тэмы свайго аповеду воін-інтэрыацыяналіст. І услед за гэтым зазначае: – Канешне, на вайне заўсёды страшна. Але для мяне страшней было не ў паветры, а на зямлі, асабліва ноччу, калі нечакана маглі напасці душманы. Звычайна, прыцэльна стралялі наёмнікі – амерыканцы, заходнееўрапейскія інструктары. Самі афганцы больш складанай зброяй валодалі дрэнна. Але затое выдатна карыстацца аўтаматам у іх умелі нават дзеці.

Як маглі, пакрысе нававбранцы абуладкоўвалі свой быт. Рабіць гэта перашхаджалі неймаверная спёка і вялізныя фізічныя нагрузкі. Нярэдка ў дзень даводзілася праводзіць у паветры з перарывамі на дазапраўку і зарадку боепрыпасамі па 8–9 гадзін. Прычым гэта былі не проста палёты. Пастаянна стралялі: з зямлі раз-пораз прасілі аказаць дапамогу. Часам нашы салдаты прасілі нават страляць па іх, бо душманы пайшлі ў рукапашную. Тады, парушаючы ўсе правілы, летчыкі зніжаліся на недапушчальную вышыню і рабілі ўсё магчымае, каб дапамагчы сваім, рызыкуючы ўласным жыццем: у такія хвіліны верталёты часта прабівалі і збівалі. Вінтакрылая машына Станіслава Ігнацьевіча Раманчука таксама тройчы атрымлівала прабоіны, але дацягвала да аэрадрома. Літаральна за ноч яе аднаўлялі, і раніцай экіпаж зноў адпраўляўся на заданне. І так кожны дзень на працягу года. Трэба сказаць, што лётчыкаў адпраўлялі ў Афганістан на год, усе астатнія былі там па два гады.

– Мы захапляліся мужнасцю дэсантнікаў і пехацінцаў, а яны і па сённяшні дзень пры сустрэчах дзякуюць нам за тое, што выручалі, вывозілі параненых і забітых, дастаўлялі прадукты, зброю, боепрыпасы, суправаджалі калоны з імі, – кажа С. І. Раманчук.

У палон лётчыкаў душманы не бралі, вялікую ўзнагароду атрымлівалі за кожны збіты верталёт. Таму ўсе, хто ваяваў у паветры, заўсёды мелі пры сабе гранату ці пісталет, бо ведалі: калі саб'юць – літасці не будзе.

Лёс аказаўся добразычлівым да Станіслава Ігнацьевіча: яго не збілі, ён ні разу не быў паранены, хоць кулі і асколкі снарадаў неаднойчы свісцелі ля вуха. Чаго не скажаш пра ўсіх таварышаў-аднапалчан. Прыкладна з 60 лётчыкаў дамоў не вярнуліся 14. Многія, нягледзячы на прышчэпкі, захворвалі на ліхаманку, малярыю з цяжкімі наступствамі накшталт гепатыту. Для гэтага дастаткова было папіць вады з ручая.

Пасля Афганістана полк С. І. Раманчука ўсім складам накіравалі ў Германію. Затым была служба на Далёкім Усходзе, у Прыморскім краі. Адтуль у пачатку 90-ых гадоў, калі развалiўся Савецкі Сагоз, Станіслаў Ігнацьевіч вярнуўся на Радзіму, у Беларусь. Месца выбраў бліжэй да бацькоў, якія пражываюць на Глыбоччыне, – у Паставах. Тут палкоўкік С. І. Раманчук з'яўляецца намеснікам камандзіра авіяцыйкага атрада па лётнай падрыхтоўцы.

– Некаторыя сёння параўноўваюць па маральным цяжары Вялікую Айчынную вайну і афганскую, – зазначае ён. – Каб не крыўдзіць ветэранаў Другой сусветнай, мы згаджаемся, што паміж імі можна паставіць знак роўнасці, але, тым не менш, гэта розныя рэчы. Калі ідзе айчынная вайна і ўвесь народ змагаецца за сваю зямлю – адно, а калі ты на чужой тэрыторыіі ваюеш незразумела за што – зусім іншае. Прыгнятала і сама абстаноўка, усюды на аэрадроме стаялі цынкавыя труны, якія прывозілі з кішлакоў, аддаленых пастоў, каб потым «чорным цюльпанам» адправіць у Саюз. А ў іх такія ж, як ты, маладыя хлопцы…

Так, Афганістан быў школай, якую маглі прайсці толькі сапраўдныя мужчыны. Не ўсе вытрымлівалі, многія са слабым характарам ламаліся псіхалагічна. За той год стаў іншым і

Станіслаў Ігнацьевіч. У яго з’явіліся жыццёвыя прынцыпы, ад якіх і зараз не адступае: абавязковасць, пунктуальнасць. Раней, у юнацтве ён быў заядлым паляўнічым, меў добрую стрэльбу. Але, вярнуўшыся дамоў, прадаў яе, і жаданне выйсці на паляванне не ўзнікае па сённяшні дзень.

Мінула 28 гадоў, а ветэран да драбніц, да кожнага каменьчыка памятае мясціны, над якімі даводзілася лётаць, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак. Па-ранейшаму яркія ў памяці карцінкі пражытых у Афганістане 365 дзён. Усе падзеі таго часу ён можа аднавіць з дакладнасцю да хвіліны, з імёнамі і прозвішчамі саслужыўцаў. Звычайна, усё гэта стараецца не ўспамінаць, не вярэдзіць лішні раз душу, хоць на пярэдадні 15 лютага, калі запрашаюць выступіць у школы або выступае ў сваёй часці перад салдатамі і маладымі афіцэрамі, перажытае зноў становіцца амаль яваю. Свядома не глядзіць і фільмы пра Афганістан, не слухае песні пра яго. Глыбокія раны той вайны не загояцца ў сэрцы ніколі.

**А. Шапавалава**